# БЯЛЯЎСКІ БАРЫС ІВАНАВІЧ



**Месца нараджэння:** г. Орша, Віцебская вобласць

**Дата нараджэння:** 03.03.1927

**Дата смерці:** 25.01.1944

**Месца подзвігу:** Віцебская вобл., Аршанскі р-н

**Дата подзвігу:** жнівень 1941 – 25.01.1944

**Ушанаванне:** Віцебская вобл., г. Орша – вуліца

Браты Бяляўскія: Іван, Анатоль, Барыс, Канстанцін – удзельнікі Аршанскага камуністычнага падполля і партызанскага руху на тэрыторыі Віцебскай вобласці ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

Браты пачалі сваю барацьбу супраць гітлераўцаў, як ім здавалася, з дробязей. Збіралі зброю, боепрыпасы на месцы былых баёў. Знаходкі хавалі спачатку ў агародах, потым – у лесе. Калі фронт адкаціўся далёка на ўсход, маладыя змагары наладзілі сувязь з кіраўніцтвам партыйнага падполля, пазней – з К. Заслонавым. Браты Бяляўскія набылі пэўны вопыт дзейнасці і сталі атрымліваць больш складаныя заданні.

Дзякуючы інфармацыі маладых разведчыкаў савецкая авіяцыя па начах наносіла бомбавыя ўдары па эшалонах, чыгуначным палатне, стратэгічна значных варожых аб’ектах. З зямлі падпольшчыкі давалі савецкім лётчыкам сігналы, што значна павялічвала эфектыўнасць бамбардзіровак.

Рыхтаваліся і ажыццяўляліся ўсё новыя і новыя дыверсійныя акты, двойчы выводзілася са строя кампрэсарная станцыя. Магнітныя міны, пясок у буксах, разведка, пранікненне ў вагоны і склады са зброяй, боепрыпасамі, прадуктамі харчавання сталі паўсядзённасцю падпольшчыкаў.

Анатоль, які быў не толькі старэйшым братам, але і памочнікам кіраўніка падпольнай групы, прыняў рашэнне пакінуць Оршу і накіравацца ў лес да партызан атрада «Дзядзі Косці». Насталі суровыя партызанскія будні.

У жніўні 1943 года Яўген Бялянка і Анатоль Бяляўскі на дарозе Орша – Лепель падарвалі састаў. Пад яго абломкамі загінулі 34 гітлераўскія ваякі, некалькі дзясяткаў былі паранены.

У гэтай аперацыі Анатоль атрымаў лёгкае раненне, і яго месца камандзіра групы заняў Барыс.

Вылазка, якой упершыню кіраваў Барыс, прынесла ўдачу. На партызанскіх мінах, расстаўленых на дарогах Орша – Смаляны, Ізмайлава – Азярок, Парэчча – Рагозіна, узарваліся дзве аўтамашыны. У кароткай сутычцы загінулі 14 фашыстаў, з іх 3 афіцэры.

У кастрычніку 1943 года Барыс з хлопцамі зноў знішчыў аўтамашыну з гітлераўцамі, дзве – з абмундзіраваннем. На дарогах Янова – Багушэўск, Янова – Крупяжына на мінах узляцелі легкавая машына са штабным афіцэрам, грузавік з правіянтам. Крыху пазней група ў складзе Барыса, падрыўнікоў Яфімава і Кудраўцава падарвала на дарозе Янова – Багушэўск тры аўтамашыны з ворагам. Было забіта 15 карнікаў, шмат паранена.

Групу «адчайных», як называлі ў атрадзе гэтых хлопцаў, увесь час прыцягвала да сябе чыгунка. На ўчастку Орша – Віцебск паляцеў пад адхон эшалон: разбіліся чатыры вагоны з жывой сілай, выйшаў са строю цэлы ўчастак палатна. А праз некалькі дзён гэтая ж група ў складзе Барыса Бяляўскага, Яфімава, Кудраўцава і Александровіча на дарозе Багушэўск – Чудня знішчыла грузавік з гітлераўцамі.

Вярнуўся ў строй Анатоль. Цяпер браты былі побач. Як члены атрада яны ўдзельнічалі ў аперацыі на «жалезцы», падчас якой на ўчастках Орша – Віцебск, Орша – Лепель за 5 дзён удалося ўзарваць каля 200 рэек.

25 студзеня 1944 года Барыс Бяляўскі і яго чатыры таварышы ў час выканання чарговага задання трапілі ў засаду ля в. Кулікі, што на Сенненшчыне. Бой быў няроўны: адзін супраць дзесяці. Скончыўся запас патронаў. Заставаліся гранаты. Калі фашысты наблізіліся на адлегласць кідка, заграмыхалі ўзрывы. Апошняй гранатай героі падарвалі сябе.

**ЛІТАРАТУРА**

1. **Белявские** // Их именами названы : энцикл. спр. / редкол.: И. П. Шамякин (гл. ред.) [и др.]. – Минск, 1987. – С. 64–65.

2. **Крашанліннікаў, Я.** Браты-героі / Я. Крашанліннікаў // Ленінскі прызыў (Орша). – 1965. – 20 крас. – С. 2. ; 22 крас. – С. 2.

3. **Крашенинников, Е.** Улица братьев Белявских / Е. Крашенинников // Знамя юности. – 1978. – 9 мая. – С. 4.

4. **Мезенка, Г. М.** Бяляўскіх вуліца / Г. М. Мезенка // Віцебшчына ў назвах вуліц : манаграфія : у 2 ч. / Г. М. Мезенка. – Віцебск, 2008. – Ч. 2. – С. 21.

5. **Сузін, Л.** Мужнасць у спадчыну / Л. Сузін // Работніца і сялянка. – 1970. – № 10. – С. 8– 9.

6. **Яршоў, І.** Браты / І. Яршоў // Телеком-экспресс (Орша). – 2009. – 24 сент. – С. 7.

**Белявские** // Их именами названы : энцикл. спр. / редкол.: И. П. Шамякин (гл. ред.) [и др.]. – Минск, 1987. – С. 64–65.

## БЕЛЯВСКИЕ

*Братья, участники Оршанского коммунистического подполья и партизанского движения на территории Витебской области в годы Великой Отечественной войны.*

Анатолий Иванович (18.11.1922 г. – май 1945 г.), родился в г. Орша Витебской области. Член ВЛКСМ. Окончил 7 классов. Работал на Оршанском льнозаводе.

Иван Иванович (22.2.1924 г. – март 1942 г.), родился там же. Член ВЛКСМ. Окончил 7 классов.

Борис Иванович (3.3.1927 г. – 25.1.1944 г.), родился там же. Член ВЛКСМ. Окончил 6 классов.

Константин Иванович (29.12.1929 г. – март 1944 г.), родился там же. Пионер. Окончил 4 класса.

Подпольная группа под руководством Ивана Белявского организована в августе 1941 г. В нее входили все братья и их мать Анна Трофимовна. Устроившись на Оршанский железнодорожный узел на работу по ремонту вагонов, братья Белявские систематически делали насечки на шейках колесных пар, подсыпали песок в буксы; такими неисправными вагонами были забиты полевые станции, запасные пути ст. Орша. Дважды выводили из строя компрессорную станцию, добывали оружие для партизан. Иван Белявский уничтожил коменданта ст. Орша, за что был зверски замучен фашистами. После этого группу возглавил Анатолий Белявский. Когда нависла угроза ареста, братья ушли в партизаны и с июля 1943 стали бойцами отряда «Дяди Кости» 1-й партизанской бригады им. К. С. Заслонова Витебской области. Братья Белявские входили в состав диверсионной группы отряда, отличались отвагой и храбростью, рвались в самые жаркие бои, на самые трудные задания. Борис Белявский погиб в бою у д. Кулики Сенненского района, похоронен в д. Воронино Сенненского района, посмертно награжден орденом Отечественной войны II степени. Константин Белявский тяжело ранен в бою и скончался по пути на Большую землю. Анатолий Белявский продолжал отважно сражаться в партизанском отряде, а после соединения с частями Красной армии – на фронте. Погиб в бою в Германии.

Именем братьев Белявских названа улица в г. Орша.